vaśminoh

Адукацыя для беларускіх дзяцей сёння і заўтра

**КОНКУРС ЗАЯВАК**

1. **Фінансавая падтрымка пілотных адукацыйных праектаў.**
2. **Фінансавая падтрымка арганізацый і ініцыятыў па нефармальным навучанні.**

**РАСКЛАД**

| | |
|---|---|
| ПАЧАТАК ПАДАЧЫ ЗАЯВАК: | 16.10.2023 |
| КАНЕЦ ПАДАЧЫ ЗАЯВАК: | 20.12.2023 |
| АБВЯШЧЭННЕ ВЫНІКАЎ | 01.02.2024 |
| СТАРТ ПРАЕКТАЎ: | люты-красавік 2024 года |
| Працягласць праекту | 3 - 6 месяцаў |

1. ***Мэты праекта Васьміног:***

- Захаванне і развіццё недзяржаўнага арганізацыйнага, інтэлектуальнага і педагагічнага рэсурсу для рэфармавання беларускай адукацыі;
- Падтрымка асобных мерапрыемстваў або кароткатэрміновых праектаў;
- Інстытуцыйная падтрымка працы беларускіх арганізацый адукацыі і ініцыятываў для дзяцей у розных краінах свету.

***Мэты грантавага конкурсу:***

1. Падтрымка, распрацоўка, умацаванне жыццяздольнасці і даследаванне інавацый у адукацыі (навучальных праграмаў, методык,

арганізацыйных мадэляў) для дзяцей у Беларусі ці ў транспамежным анлайн-фармаце.

2. Падтрымка беларускіх нефармальных адукацыйных арганізацый і ініцыятываў, кароткатэрміновых праектаў, скіраваных на ўзмацненне і распаўсюд у самых шырокіх колах мовы і беларускай культуры, функцыянальнай пісьменнасці (камунікатыўнай, сацыяльнай, грамадзянскай і г.д.), а таксама падтрымка настаўнікаў як у Беларусі, так і ў эміграцыі, якія працуюць афлайн і анлайн.

***2. Хто можа ўдзельнічаць у конкурсе?***

Праекты могуць рэалізоўваць беларускія навучальныя ўстановы і ініцыятывы, а таксама фізічныя асобы (настаўнікі, асветнікі, навукоўцы ў галіне адукацыі, аўтары навучальных матэрыялаў) як у Беларусі, так і ў эміграцыі, афлайн і анлайн. Фізічныя асобы і незарэгістраваныя ініцыятывы могуць падаваць заяўкі толькі ў партнёрстве з зарэгістраванай некамерцыйнай арганізцыяй.

Конкурс праводзіцца для:

- Беларускіх адукацыйных установаў і ініцыятываў у Беларусі і за мяжой, якія працуюць афлайн і анлайн;
- Адукацыйных арганізацыяў грамадзянскай супольнасці ў Беларусі, суседніх краінах ці краінах-сябрах ЕЗ;
- Асобаў, якія дзейнічаюць ад імя нефармальнай групы або ініцыятывы;
- Школьных настаўнікаў, чыя дзейнасць па большай частцы праходзіць у Беларусі;
- Дзеячаў культуры і адукацыі.

**Крытэры выбару:**

Заяўнікі (фізічныя асобы, ініцыятывы, арганізацыі) павінны быць актыўнымі ў адукацыйнай сферы.

Заяўнікі могуць падаць заяўку індывідуальна ці ў партнёрстве. У якасці галоўнай арганізацыі (вядучага заяўніка) павінна выступаць адна зарэгістраваная арганізцыя. Вядучаму заяўніку дазваляецца выступаць у якасці партнёра ў іншых праектах.

Арганізацыі-атрымальнікі павінны мець сістэму фінансавага кіравання для забеспячэння належнай справаздачнасці і кантролю ці быць гатовымі прайсці навучанне па кіраванні фінансамі і прадставіць неабходную пацвярджальную дакументацыю.

Заяўнікі павінны мець рахунак у еўрапейскім банку.

Арганізатары конкурсу могуць запытаць інфармацыю пра дзейнасць заяўнікаў (напрыклад, статут, справаздачы пра дзейнасць, партфоліа).

***3. Якія актыўнасці могуць быць падтрыманы?***

**У межах першай мэты конкурса падтрымліваюцца:**

- Распрацоўка і прасоўванне новага зместу адукацыі, праграм, накіраваных на фармаванне нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў, забеспячэнне моўнай, камунікатыўнай, лічбавай і грамадзянска-прававой пісьменнасці, крытычнага мыслення сярод мэтавых групаў, у прыватнасці - альтэрнатыўных адукацыйных праграм для дашкольнікаў і школьнікаў у фармаце дадатковай адукацыі.

- Распрацоўка навучальна-метадычных матэрыялаў і праграмаў. Прыярытэтныя напрамкі - гісторыя, культура, літаратура Беларусі, грамадазнаўства і іншыя прадметы праграмы агульнаадукацыйнай школы на беларускай мове.

- Распрацоўка і прасоўванне адукацыйных праграм для розных катэгорый настаўнікаў і іншых педагогаў у форме стажыровак.

- Стварэнне анлайн-курсаў і/ці ўрокаў па прадметах: беларуская мова, беларуская літаратура, гісторыя Беларусі, краязнаўства, геаграфія Беларусі, мастацтва Беларусі.;

- Стварэнне падкастаў;

- Стварэнне навучальных відэа;

- Распрацоўка навучальных дапаможнікаў, навучальных і асветніцкіх матэрыялаў, якія будуць размешчаныя на анлайн-платформе праекту "Васьміног";

Прыярытэтна будуць разглядацца праекты з інавацыйнымі элементамі, пілотныя праекты з патэнцыялам тыражавання ў шырэйшым маштабе. Новы ці дапоўнены адукацыйны кантэнт можа быць распрацаваны для выкарыстання ў рамках існай школьнай праграмы.

**Важна:** *Усе вынікі праектаў, якія атрымалі фінансавую падтрымку, будуць апублікаваны на сайце праекта "Васьміног".*

**У межах другой мэты конкурса падтрымліваюцца:**

- Праекты па арганізацыі лакальных, афлайнавых, вочных адукацыйных мерапрыемстваў;
- Беларускія культурна-асветніцкія і адукацыйныя цэнтры ў выгнанні;
- Семінары, лабараторыі, хакатоны, канферэнцыі і г.д., якія адпавядаюць мэтам праекта;
- Навучальныя курсы, серыі майстар-класаў;
- Летнікі і лагеры для дзяцей;
- Распрацоўка і распаўсюджанне навучальных і асветніцкіх матэрыялаў і інш.

Праекты з інавацыйнымі элементамі, праекты з патэнцыялам тыражавання ў шырэйшым маштабе будуць мець прыярытэт.

**4.** ***Бюджэт і тэрміны рэалізацыі праекта.***

- максімальны бюджэт: 20 000 еўра
- мінімальны бюджэт: 1000 еўра

Працягласць праектаў - ад 3 да 6 месяцаў.
Грант пакрывае 100% бюджэту.
Суфінансаванне не патрабуецца.
Магчымае выдзяленне гранту для суфінансавання праектаў, калі яны фінансуюцца за кошт прыватных сродкаў ці іншых рэсурсаў, якія не адносяцца да рэсурсаў з фондаў ЕЗ.

***5. Як падаць заяўку на конкурс? Крытэры адбору.***

**Працэдура адбору складаецца з трох этапаў:**

1. **Крытэры прымальнасці. Прадстаўленне інфармацыі**

**Праверка адпаведнасці патрабаванням, адміністрацыйным крытэрам і патэнцыялу арганізацыі-заяўніка**

Для падачы заяўкі неабходна запоўніць устаноўленую форму заяўкі на беларускай або англійскай мове (якую можна спампаваць тут) да тэрміну, пазначанага ў Рэгламенце (гл. вышэй). Пасля адпраўкі заяўкі ўнесці змяненні немагчыма. Заяўка складаецца з анкеты, апісальнай часткі і бюджэту.

Дадаткова трэба падаць (у фармаце PDF):

- рэзюмэ ўдзельнікаў каманды праекта  (не больш за 1 старонку на кожнага члена каманды);

- партфоліа арганізацыі і паасобных чальцоў каманды (пералік асноўных мерапрыемстваў у сферы адукацыі і культуры, рэалізаваных на працягу апошніх двух гадоў).

Прапановы па праектах будуць правераныя на адпаведнасць крытэрам прымальнасці, указаных у Конкурсе прапановаў. У адносінах да заяўнікаў будуць праведзены праверкі, каб пераканацца ў сапраўднасці заяўніка і паслужным спісе яго дзейнасці. Калі заяўка адхіляецца па фармальных прычынах на гэтым этапе, заяўнік атрымае адпаведны ліст на электронную пошту.

**2) Крытэры адбору і ацэнка**

Праект праходзіць ацэнку ў два этапы: спачатку заяўку разглядаюць як мінімум два незалежныя эксперты, пісьмова і незалежна адзін ад аднаго; потым заяўкі разам з ацэнкамі экспертаў паступаюць на разгляд Адборачнай камісіі.

**3) Абмеркаванне і рашэнне Адборачнай камісіі**

У склад Адборачнай камісіі ўвойдуць прадстаўнікі партнёраў праекту "Васьміног" і незалежныя запрошаныя эксперты. Кожны сябра Адборачнай камісіі ацэньвае праектныя прапановы ў адпаведнасці з ацэначнай сеткай і ўлічвае балы незалежных экспертаў.

Адборачная камісія прымае канчатковае рашэнне на пасяджэнні.

Адборачная камісія мае магчымасць даваць кандыдатам рэкамендацыі па паляпшэнні прапановаў і прапаноўваць змены ў бюджэце.

Час працэдуры адбору складае 1 месяц пасля заканчэння тэрміну падачы заявак.

Пасля выбару праектаў для падтрымкі іх заяўнікі падпісваюць адпаведнае пагадненне.
Для заяўнікаў, якія працуюць у Беларусі ці будуць атрымліваць грантавую падтрымку на тэрыторыі Беларусі, патрабаванні бачнасці і публічнасці будуць неабавязковымі.

| **Крытэры** | | **Максімум балаў** |
|---|---|---|
| **1. Адпаведнасць, актуальнасць і запатрабаванасць праекта** | | **20** |
| 1.1. Наколькі мэты і прыярытэты праекта адпавядаюць мэтам і прыярытэтам конкурсу праекта "Васьміног"? | | 5 |
| 1.2. Наколькі ясная і абгрунтаваная пазіцыя заяўніка, чаму праект актуальны для беларускай адукацыі і мэтавай аўдыторыі? Ці дакладна вызначаны патрэбы мэтавых груп, і ці ўлічвае іх праект належным чынам? | | 5 |
| 1.3. Наколькі дакладна вызначаны і стратэгічна правільна выбраны ўдзельнікі (канчатковыя бенефіцыяры, мэтавыя групы)? | | 5 |
| 1.4. Ці змяшчае прапанова элементы інавацыі па зместу адукацыі і форме? | | 5 |

| | | |
|---|---|---|
| **2. Якасць кантэнту і актыўнасцей** | | **15** |
| 2.1. Наколькі паслядоўная і лагічная задумка дзеяння? Ці з'яўляюцца прапанаваныя мерапрыемствы дарэчнымі, практычнымі і ці адпавядаюць чаканым вынікам? | | 5 |
| 2.2. Ці ўключае прапанова дакладныя зыходныя дадзеныя, паказчыкі поспеху і крыніцы праверкі, якія дазволяць убачыць звонку і ацаніць вынікі праекта? | | 5 |
| 2.3. Ці змяшчае прапанова належны аналіз закранутых праблем і магчымасцей зацікаўленых бакоў? | | 5 |
| **3. Устойлівасць і узнаўляльнасць** | | **20** |
| 3.1. Ці акажа актыўнасць адчувальнае ўздзеянне на мэтавыя групы? | | 5 |
| 3.2. Ці верагодна, што дзеянне будзе мець мультыплікатыўны эфект, у тым ліку магчымасць тыражавання, пашырэнне выкарыстання вопыту і абмен ведамі? | | 5 |
| 3.3. Ці з'яўляюцца чаканыя вынікі прапанаванага дзеяння ўстойлівымі?<br>- Фінансавая ўстойлівасць: планаванне атрымання рэсурсаў для падтрымання і працягу работы з асноўнай мэтавай групай;<br>- інстытуцыйная ўстойлівасць: арганізацыйная структура, якая дазволіць працягваць працу пасля заканчэння праекту; | | 5 |

| | | |
|---|---|---|
| 3.4. Ці магчыма пашырэнне мэтавай групы/груп праекта? | | 5 |
| **4. Якасць кіравання праектамі і аператыўныя магчымасці** | | **20** |
| 4.1. Як арганізавана каманда праекта? Ці адпавядае яе структура праекту? | | 5 |
| 4.2 Ці валодаюць заяўнікі дастатковымі тэхнічнымі ведамі (асабліва ведамі па пытаннях, якія неабходна вырашыць)? | | 5 |
| 4.3. Ці маюць заяўнікі дастатковы ўнутраны арганізацыйны патэнцыял (уключаючы персанал, абсталяванне і здольнасць распараджацца бюджэтам праекту)? | | 5 |
| 4.4. Ці дастатковыя фінансавыя магчымасці каманды, ці ёсць у каманды досвед кіравання праектамі з аналагічным бюджэтам? | | 5 |
| **5. Бюджэт і эканамічная эфектыўнасць мерапрыемства** | | **15** |
| 5.1. Ці адлюстраваны актыўнасці належным чынам у бюджэце? Ці ўсе запланаваныя выдаткі абгрунтаваныя, ці няма завышаных артыкулаў затратаў, ці ўсе неабходныя артыкулы затратаў улічаныя? | | 5 |
| 5.2. Ці здавальняючае суадносіны меркаваных выдаткаў і чаканых вынікаў? | | 5x2** |
| **6. Ацэнка рызык** | | **10** |

| | | |
|---|---|---|
| 6.1. Наколькі аб’ектыўна заяўнік ацаніў патэнцыйныя вонкавыя і ўнутраныя рызыкі па невыкананні або незаканчэнні праекта; | | 5 |
| 6.2. Наколькі прадугледжаны камандай захады і дзеянні для пераадолення паўсталых рызык, неспрыяльных умоваў для рэалізацыі праекта. | | 5 |
| **Максімальны агульны бал 100** | | **100** |

**: гэтая ацэнка памнажаецца на 2 праз яе важнасць.

***6. Калі вы прайшлі адбор***

Пасля прыняцця рашэння пра выдзяленне гранта заяўнік падпісвае пагадненне, дзе будуць падрабязна пазначаныя патрабаванні па справаздачнасці. У агульных рысах справаздачнасць будзе складацца з:

- апісальнай справаздачы, якая адсочвае сумесна ўзгодненыя паказчыкі рэалізацыі і эфектыўнасці праекту;
- фінансавай справаздачы з падрабязным пералікам выдаткаў, якія суправаджаюцца пацвярджальнымі дакументамі для будучага аўдыту.

Заяўнік атрымае апошнюю частку фінансавання праекту (20%) пасля прадстаўлення і зацвярджэння справаздачы.
Шаблоны для апісальных і фінансавых справаздачаў будуць прадстаўленыя разам з дамовай пра грант.

Увесь працэс будуць суправаджаць грант-менеджары: рыхтаваць дамовы, удакладняць бюджэты і заўвагі і прапановы па змесце, кантраляваць выкананне, прымаць справаздачы і дапамагаць (кансультаваць) па форме і патрабаваннях справаздачы.

Падпісаўшы пагадненне пра грант, заяўнік пагаджаецца ўпаўнаважыць праект “Васьміног” і Прадстаўніцтва ЕК ажыццяўляць паўнамоцтвы па кантролі над дакументамі і доказамі выдаткаў. Пры невыкананні ўзгодненых тэрмінаў і абавязацельстваў па справаздачнасці, а таксама недастатковай якасці справаздачы, грантадаўца мае права патрабаваць вяртання гранту.

***7. Крытэры адхілення***

**7.1 Адхіленне ад удзелу**

Заяўнік (кіраўнік праекта і партнёры) будзе выключаны з удзелу ў тэндары, калі ён знаходзіцца ў адным з наступных выпадкаў:

а) ён з'яўляецца банкротам, у дачыненні да якога пачатая справа пра неплацежаздольнасць або ліквідацыю, яго актывы знаходзяцца ў стане ліквідацыі;

б) канчатковым судом або канчатковым адміністрацыйным рашэннем было ўстаноўлена, што заяўнік парушае абавязацельствы па выплаце падаткаў або сацыяльнага забеспячэння ўнёскаў у адпаведнасці з заканадаўствам краіны, дзе знаходзіцца ўпаўнаважаны супрацоўнік, або краіны рэалізацыі гранта;
в) канчатковым судом або канчатковым адміністрацыйным рашэннем было ўстаноўлена, што заяўнік вінаваты ў сур'ёзных прафесійных парушэннях, якія парушаюць дзейныя законы ці правілы або этычныя нормы прафесіі, да якой належыць заяўнік, або ён браў удзел у любых супрацьпраўных паводзінах, якія ўплываюць на яго прафесійны аўтарытэт.
г) ён паказаў значныя недахопы ў выкананні асноўных абавязацельстваў у выкананні кантракту, пагаднення аб гранце або рашэння аб гранце, якія фінансуюцца ЕК. Калі заяўнік знаходзіцца ў адной з сітуацый выключэння, пералічаных вышэй, ён павінен пазначыць меры, якія прымяняюцца для выпраўлення сітуацыі выключэння, прадэманстраваўшы тым самым сваю надзейнасць. Яны могуць уключаць у сябе, напрыклад, тэхнічныя, арганізацыйныя і кадравыя меры па прадухіленні далейшага ўзнікнення падобных сітуацый, кампенсацыі шкоды або выплаты штрафаў.
д) мае дачыненне (член сям'і ці супрацоўнік) да членаў адборачнай камісіі ці ацэначнага камітэту.

**7.2 Адмова ад працэдуры атрымання гранта**

Заяўнік не атрымае грант на гэтую працэдуру, калі:
а) ён знаходзіцца ў сітуацыі выключэння, устаноўленай у адпаведнасці з вышэйзгаданым раздзелам 7.1;
б) ён сказіў інфармацыю, якая патрабуецца ў якасці ўмовы для ўдзелу ў працэдуры, або не прадставіў гэтую інфармацыю;
в) ён удзельнічаў у падрыхтоўцы конкурсу прапаноў, калі гэта стварае канфлікт інтарэсаў (валоданне інсайдарскай інфармацыяй, асабістая зацікаўленасць, магчымасць паўплываць на прыняцце рашэння, абмежаванне ці парушэнне правілаў канкурэнцыі і г.д.).

***8. Умовы фінансавання***

**а) Пазбяганне падвойнага фінансавання**

Аднолькавыя выдаткі не павінны двойчы фінансавацца з бюджэту донарскай арганізацыі. Заяўнікі павінны пазначыць у форме заяўкі крыніцы і сумы фінансавання, атрыманага або заяўленага на той жа праект або яго частку, або для яго функцыянавання на працягу таго ж фінансавага года, а таксама любое іншае фінансаванне, атрыманае або заяўленае для таго ж дзеяння (праекту).

**б) Адсутнасць зваротнай сілы**

Грант не можа быць выдзелены постфактум для ўжо выкананых мерапрыемстваў.
Грант можа быць выдзелены на пачатае дзеянне толькі тады, калі заяўнік можа прадэманстраваць неабходнасць пачатку дзеяння да падпісання

грантавага пагаднення. У такіх выпадках выдаткі, якія прымаюцца для фінансавання, не могуць быць панесеныя да даты падачы  заяўкі на грант.

**в) Суфінансаванне**

Суфінансаванне азначае, што рэсурсы, неабходныя для правядзення праекту, могуць не цалкам пакрывацца грантам ЕК.

Суфінансаванне можа мець форму:

- уласных сродкаў бенефіцыяра;
- прыбытка ад дзеянняў;
- фінансавых унёскаў трэціх асобаў.

**г) Збалансаваны бюджэт**

Бюджэт праекту прыкладаецца да заяўкі. Бюджэт мусіць быць збалансаваным, г.зн. агульныя выдаткі павінны быць роўныя агульнаму даходу, уключна з грантам, на які падаецца заяўка. Бюджэт павінен быць складзены ў еўра. Заяўнікі, якія прадугледжваюць, што выдаткі не будуць панесеныя ў еўра, павінны выкарыстоўваць апублікаваны абменны курс ЕК на сайце Exchange rate (InforEuro)

**д) Кантракты на выкананне/субпадрад**

Калі рэалізацыя мерапрыемства патрабуе закупкі тавараў, работ або паслугаў (кантракты на рэалізацыю), сумарны кошт якой перавышае 2500 еўра, заяўнікі павінны атрымаць канкурэнтныя тэндары (прапановы) ад патэнцыйных падрадчыкаў і заключаць кантракт з падрадчыкам, які прапануе лепшыя суадносіны кошту і якасці, захоўваючы тэндарную дакументацыю на выпадак праверкі.

***9. Абарона дадзеных***

Адказ на любую заяўку ўключае ў сябе запіс і апрацоўку персанальных дадзеных (такіх як імя, адрас і рэзюмэ). Такія дадзеныя будуць апрацоўвацца ў адпаведнасці з Рэгламентам (ЕС) №45/200121 аб абароне фізічных асоб у дачыненні да апрацоўкі персанальных дадзеных грамадскімі інстытутамі і органамі, і аб свабодным перамяшчэнні такіх дадзеных.

Любыя запытаныя дадзеныя заявак  будуць апрацаваны выключна з мэтай  ацэнкі экспертаў у адпаведнасці са спецыфікай конкурса.

Заяўнік мае права на доступ і права на выпраўленне дадзеных, якія яго тычацца. Па пытаннях, звязаных з гэтымі дадзенымі, звярніцеся да грант-менеджара. Заяўнікі маюць права звярнуцца да Еўрапейскага кантралёра па абароне дадзеных у любы час. Падрабязная заява аб прыватнасці, у тым ліку кантактная інфармацыя, даступныя на вэб-сайце ЕК European Commission, official website

***10. Кантакты***

Запоўненыя заяўкі накіроўваюцца на пошту **grant.vasminoh@gmail.com**